БЕЛТЭЛЕКАМ

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі
Рэспублікі Беларусь

**Рэспубліканскае унітарнае
прадпрыемства электрасувязі
«БЕЛТЭЛЕКАМ»
(РУП «БЕЛТЭЛЕКАМ»)**

вул. Энгельса, 6, 220030, г. Мінск
тэл. (017) 217 10 06, факс (017) 327 44 22, тэлекс + (681) 252493 OKA BY
e-mail: info@main.beltelecom.by, http://www.beltelecom.by
Р.р. BY05 AKBB3012 1002 7001 8550 0000
у ААТ «ААБ Беларусбанк» г. Мінска, код AKBBBY2X, УНП 101007741

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь

**Республиканское унитарное
предприятие электросвязи
«БЕЛТЕЛЕКОМ»
(РУП «БЕЛТЕЛЕКОМ»)**

ул. Энгельса, 6, 220030, г. Минск
тел. (017) 217 10 06, факс (017) 327 44 22, телекс + (681) 252493 OKA BY
e-mail: info@main.beltelecom.by, http://www.beltelecom.by
Р.с. BY05 AKBB3012 1002 7001 8550 0000
в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минска, код AKBBBY2X, УНП 101007741

СТБ ISO 9001

ПРЕМИЯ ПРАВИТЕЛЬСТВА КАЧЕСТВО БЕЛАРУСЬ 2021

02.05.2024 № 16-11/К-108/106

На № К-108 ад 08.04.2024

Мінскі філіял РУП «Белтэлекам»

Адказ на зварот

Па выніках разгляду Вашага звароту паведамляем наступнае.

Згодна з Правіламі аказання паслуг электрасувязі, зацверджанымі пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17.08.2006 №1055, пералік паслуг электрасувязі, якія аказваюцца аператарам электрасувязі, пастаўшчыком паслуг электрасувязі, вызначаецца імі з улікам умоў спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), тэхнічных магчымасцей сетак і сродкаў электрасувязі, патрабаванняў абанентаў і (або) карыстальнікаў паслуг электрасувязі.

Рэканструкцыя і будаўніцтва сетак сувязі з дапамогай валаконна-аптычных ліній сувязі (далей - ВАЛС) па населеных пунктах рэспублікі, у тым ліку і Мінскай вобласці, ажыццяўляецца РУП «Белтэлекам» паэтапна ў адпаведнасці з планамі капітальнага будаўніцтва, з улікам эканамічнай эфектыўнасці і неабходнасці раўнамернага размеркавання інвестыцый па аб'ектах будаўніцтва па ўсіх структурных падраздзяленнях філіялаў (ЗВЭС, ЦЭС, ВЭ).

Па звестках Янушкавіцкага сельскага выканаўчага камітэта ў в. Казлеўшчына Лагойскага раёна зарэгістравана 11 хатніх гаспадарак, пастаянна пражывае 18 жыхароў.

У цяперашні час паслугі электрасувязі жыхарам в. Казлеўшчына прадастаўляюцца па меднажыльных кабельных лініях сувязі, якія забяспечваюць аказанне паслуг належнай якасці ў адпаведнасці з выбранымі тарыфнымі планамі.

Мэтазгоднасць будаўніцтва ВАЛС разглядаецца РУП «Белтэлекам» з улікам ацэнкі эканамічнай эфектыўнасці, а таксама патрэбнасці і планіруемага аб'ёму падключэння паслуг жыхарам населеных пунктаў з улікам зарэгістраваных заяў на аказанне паслуг электрасувязі.

Заяў ад жыхароў в. Казлеўшчына на падключэнне іншых тарыфных планаў з павелічэннем хуткасці ў Лагойскім ЦЭ Смалявіцкага ЗВЭС не зарэгістравана.

Для аказання паслуг электрасувязі жыхарам в. Казлеўшчына па валаконна-аптычных лініях сувязі (далей - ВАЛС) неабходна выканаць работы па пракладцы ВАЛС працягласцю каля 2,1 км з уладкаваннем двух скрытых пераходаў праз асфальтаваную дарогу і аднаго скрытага пераходу праз аўтамабільную дарогу Р-58 з далейшым будаўніцтвам размеркавальнай і абаненцкай сетак сувязі па населеным пункце каля 4 км.

Для вывучэння попыту на падключэнне паслуг электрасувязі па тэхналогіі PON спецыялістамі Лагойскага ЦЭ з выездам на месца ў верасні 2023 года было праведзена анкетаванне жыхароў в. Казлеўшчына. У выніку анкетавання толькі 7 жыхароў далі згоду на падключэнне паслуг электрасувязі па ВАЛС.

Улічваючы трасу пракладкі ВАЛС, а таксама прымаючы да ўвагі малую колькасць жыхароў, якія пастаянна пражываюць у в. Казлеўшчына, выкананне работ па будаўніцтве ВАЛС у гэтым населеным пункце планамі капітальнага будаўніцтва Мінскага філіяла РУП «Белтэлекам» на 2024-2025 гг. не прадугледжана.

У цяперашні час для жыхароў в. Казлеўшчына Лагойскага раёна ёсць магчымасць прадастаўлення паслуг электрасувязі па медных кабельных лініях сувязі (тэхналогія ADSL).

Для афармлення дагаворных адносін на падключэнне паслуг па медных кабельных лініях сувязі жыхарам в. Казлеўшчына неабходна ва ўстаноўленым парадку звяртацца ў сэрвісны цэнтр Лагойскага ЦЭ па адрасе: г. Лагойск, вул. Цімчука, 1, рэжым працы: панядзелак-пятніца з 09.00 да 19.00, субота з 09.00 да 14.00, нядзеля, святочныя дні - выхадны. Таксама заява на падключэнне паслуг можа быць пададзена з дапамогай афіцыйнага сайта https://beltelecom.by.

Выказваем Вам сваю павагу. Дзякуем за цікавасць, праяўленую да дзейнасці РУП «Белтэлекам».

Дадаткова інфармуем, што ў выпадку ўзнікнення пытанняў, звязаных з аказаннем паслуг РУП «Белтэлекам», Вы таксама можаце звяртацца па тэлефоне «гарачай лініі» Мінскага філіяла РУП «Белтэлекам» № (8017) 500-14-75 (час працы: панядзелак-пятніца з 9.00 да 13.00, з 14.00 да 16.00).

На падставе часткі першай пункта 1 артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» у выпадку нязгоды з гэтым адказам Вы можаце яго абскардзіць, звярнуўшыся ў Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь па адрасе: 220050, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 10, або даслаўшы электронны зварот праз сайт https://обращения.бел.

Першы намеснік
генеральнага дырэктара
РУП «Белтэлекам» Г.В.Мельнікаў